СУСТРЭЧЫ

КАЗКІ РОДНАЙ ПРЫРОДЫ

У гродзенскай гімназіі № 6 – чарговае літаратурнае мерапрыемства. Тут выступіла пісьменніца Ірына Салата.



У межах літаратурна-адукацыйнага праекта «Жывое слова: урокі з пісьменнікамі» і Тыдня пачатковай школы ў гімназіі № 6 імя Ф. Э. Дзяржынскага г. Гродна прайшла цёплая і натхняльная сустрэча. Галоўнай дзеючай асобай літаратурнай гасцёўні пад назвай «Казкі роднай прыроды» стала вядомая гродзенская празаік, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Ірына Аркадзьеўна Салата.

Наведаць «Казкі роднай прыроды» пашчасціла вучням 3 і 4 класаў. Для юных чытачоў сустрэча з сучасным пісьменнікам стала сапраўдным святам літаратуры і творчасці.

Ірына Аркадзьеўна прэзентавала гімназістам сваю новую кнігу казак пад назвай «Анютка і ландышы». Гэтае выданне ўжо паспела атрымаць высокую адзнаку: у 2026 годзе кніга прынесла яе аўтару перамогу ў Абласным літаратурным конкурсе імя Максіма Багдановіча. Пісьменніца пачытала ўрыўкі са сваіх твораў, расказала шмат цікавых гісторый аб тым, як задумваліся і ствараліся яе кнігі.

Асаблівым сюрпрызам для дзяцей сталі падарункі. На памяць аб сустрэчы гімназісты атрымалі лялек-марцінічак, зробленых рукамі самой пісьменніцы. Госця патлумачыла,

што такіх лялек звычайна дораць сваякам і знаёмым з пажаданнямі здароўя і шчасця, таму кожны падарунак стаў для дзяцей сапраўдным талісманам дабра.

Сустрэча ў рамках Тыдня пачатковай школы атрымалася вельмі цікавай і пазнавальнай. Юныя слухачы зразумелі, што свет сучаснай беларускай дзіцячай літаратуры захапляльны і вельмі яскравы.

Юлія ЧАМЯРЫС
пісьменніца-педагог,
кіраўнік Гродзенскага гарадскога
літаратурнага аб'яднання «Надзея»,
ініцыятар і куратар праекта
«Жывое слова: урокі з пісьменнікамі»

На здымках: у гасцях у навучэнцаў гімназіі № 6 імя Ф. Э. Дзяржынскага г. Гродна член Саюза пісьменнікаў Беларусі, празаік, дзіцячая пісьменніца Ірына Салата. Лістапад 2026 года.




Літературн
«Казкі


АОУЫЭ ЛМНРЙ БВГДЖЗ Ъ
ЯЁЮИЕ ПФКТШ СХЦЧЩЬ


Літаратурная гасцёўня
„Казкі роднай прыроды"


Ірына САЛАТА
Ірына Салата


АОУЫЭ ЛМНР
ЯЁЮИЕ


Літературная гасцёўня
„Казкі роднай прыроды"





Государственное учреждение образования
«Гимназия №6
имени Ф.Э.Дзержинского г.Гродно»

www.pisateli.by